Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-06-01

# У гонар самаадданага асветніка



У Віцебску адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі і выставы, прысвечаных славутаму вучонаму, аднаму з заснавальнікаў Беларускай акадэміі навук і арганізатараў масавага краязнаўчага руху ў краіне Мікалаю Касьпяровічу.

Яго жыццё непарыўна звязана з горадам над Дзвіной. Пасля ўваходжання часткі Віцебскай губерні ў склад Беларускай ССР разгарнулася мэтанакіраваная работа па вяртанні і аднаўленні нацыянальнай культуры, падмацаваная дзяржаўнай палітыкай беларусізацыі. З пачатку жніўня 1924 года Мікалай Касьпяровіч быў прызначаны Наркамам асветы БССР на пасаду інспектара акруговага аддзела адукацыі. Паралельна кароткі віцебскі перыяд жыцця вучонага насычаны значнымі справамі. Менавіта ў гэты час ім пачаты многія даследаванні, што потым ляглі ў аснову друкаваных прац.

Мікалай Касьпяровіч стаў ініцыятарам стварэння Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства, якое аб'яднала больш за 100 сяброў, абапіралася на сетку павятовых і школьных арганізацый і працавала ў адпаведнасці з праграмай Інстытута беларускай культуры. У Віцебску пабачылі свет кнігі Мікалая Касьпяровіча "Беларуская архітэктура" і "Беларускі арнамент". Пры яго падтрымцы ў горадзе адкрыўся мясцовы філіял літаратурнага аб'яднання "Маладняк" і была распачата справа вяртання моўнай спадчыны краю. Слоўнікавы матэрыял, сабраны краязнаўцам і яго аднадумцамі ў той час, і цяпер мае вялікае значэнне. Навуковая дзейнасць Мікалая Іванавіча цесна звязана з педагогікай. У Віцебску ён выкладаў родную мову і літаратуру, гісторыю і геаграфію Беларусі ў мастацкім і прамыслова-эканамічным тэхнікумах. У гадавіну з дня нараджэння Мікалая Касьпяровіча ў абласным краязнаўчым музеі адбылася тэматычная выстава, а на будынку па вуліцы Крылова,4, дзе жыў вучоны-падзвіжнік, была ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел мясцовыя краязнаўцы, дзеячы навукі і мастацтва, а таксама прадстаўнікі ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама і родныя Мікалая Іванавіча з Віцебска і Вялікага Ноўгарада.


М. І. КАСЬПЯРОВІЧ

ВІЦЕБСКІ КРАЁВЫ СЛОЎНІК

(МАТАР'ЯЛЫ)

**Таццяна БОНДАРАВА.**

Таццяна Бондарава. У гонар самаадданага асветніка